ХТО ЯЗЫК ДОЎГІ МАЕ, БЕЗ ГРОШАЙ БЫВАЕ 5

НА ІГОЛКУ МОЖНА СЕСЦІ. І МОЖНА ЗЛЕЗЦІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 106 (29220)

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый САДОХА, дырэктар Нацыянальнага цэнтра маркетынгу Міністэрства замежных спраў:

«На тавары харчовай групы, якія Беларусь вырабляе ў вялікай колькасці, попыт захаваецца, бо ў асобных рэгіёнах пандэмія прывядзе да памяншэння сельскагаспадарчай вытворчасці. Пасля ажыўлення сусветнай транспартнай сістэмы павысіцца попыт і на беларускія нафтапрадукты. Улічваючы, што ў Беларусі практычна ўсе прадпрыемствы не спынялі сваю работу, краіна не адчуе тых выдаткаў, якія панясуць іншыя дзяржавы ў час аднаўлення вытворчасцяў, прыпыненых на перыяд каранціну. У сувязі з гэтым айчынная прадукцыя будзе больш канкурэнтаздольная».

Свістулька «на кані»

Супрацоўнікі Бешанковіцкага Дома рамёстваў падрыхтавалі дасье на сапраўдны рарытэт свайго рэгіёна — старажытную гліняную цацку-свістульку, каб надаць ёй статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Беларусі. У мястэчку над Дзвіной у майстроў спрадвеку былі свае фірменныя пластычныя стылі свістулек у форме чалавечка, вершніка, баранчыка — нават у раскопках такія знаходзілі.

— Каб наша цацка прайшла навуковую экспертызу, мы павінны захаваць асаблівасці формы і традыцыйны спосаб яе вырабу, — кажа майстар і дырэктар установы Алеся Аўчыннікава. — Бо акрамя нашага раёна, на наданне ахоўнага статусу падзвінскім і падняпроўскім свістулькам пададуць заявы Віцебскі, Дубровенскі, Лёзненскі, Сенненскі і Полацкі дамы рамёстваў.

На гэтым фота — майстар па лепцы, маляванні і абпальванні свістулек Алеся АЎЧЫННІКАВА *(злева)* і майстар-метадыст Аксана ЛЕЙЧАНКА з «наваспечанымі» бешанковіцкімі вершнікамі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КОРАТКА

- **Дзяржава будзе кампенсаваць бацькам дзяцей-інвалідаў палову мытных пошлін пры ўвозе легкавых аўто.**
- У Беларусі выпусцілі новы гістарычны атлас.
- **Фота рарытэтаў Нацыянальнага гістарычнага музея ўпрыгожылі агароджу мінскага парку Чалюскінцаў.**



- Расія дазволіла ўезд беларускім вахтавікам.
- **Плошча, занятая баршчэўнікам Сасноўскага ў Мінску, з 2011 года скарацілася амаль у 9 разоў.**
- Траціну сельгасзямель у Беларусі складаюць меліяраваныя.
- **Ва Ушачах сёлета плануюць адкрыць новую школу мастацтваў.**

Калі вада — бяда

Як адпачыць без рызыкі для жыцця?

Абстаноўка з надвор'ем пакуль не вельмі спрыяе адпачынку каля вады. Яно і нядзіўна — доўгі час тэмпература паветра не ўздымаецца вышэй за 20 градусаў, да гэтага дадаюцца частыя дажджы і прахалодныя ночы. Але ж так будзе не ўсё лета. Ужо ў канцы гэтага тыдня слупок тэрмометра нарэшце пераадолее дваццаціградусную адзнаку. А гэта значыць, што да вадаёмаў масава пацягнуцца адпачывальнікі.

— У Мінскай вобласці вызначаны 105 зон адпачынку, — паведаміў **старшыня Мінскай абласной арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Сяргей ПАТРЫКЕЕЎ.** — Перад адкрыццём купальнага сезона іх ужо праверылі вадалазы — на дне не павінна ляжаць патэнцыйна небяспечных для купальшчыкаў прадметаў. Дзе спатрэбілася, добраўпарадкавалі і берагавую тэрыторыю, паставіўшы навесы, біятуалеты, кабінкі для пераадзявання. СТАР. 11

Размова па сутнасці

Андрэй ХУДЫК:

«Неабходна мабілізацыя ўсіх узроўняў улады, грамадства і бізнесу для сумесных дзеянняў па ахове прыроды»

Напярэдадні Дня аховы навакольнага асяроддзя міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык расказаў, для чаго патрэбны экалагічны рэйтынг развіцця рэгіёнаў, ці можна ў Беларусі выкарыстоўваць энергію нетраў і якія «зялёныя» кірункі становяцца нацыянальным прыярытэтам. СТАР. 8

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!